# Уплыў статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці на захаванне розных катэгорый нематэрыяльнай культурнай спадчыны

Нематэрыяльная культурная спадчына (НКС) згодна Канвенцыі ЮНЕСКА 2003 г. выяўляецца ў наступных абласцях:

вусныя традыцыі і формы выражэння, якія ўключаюць мову ў якасці носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

выканальніцкія мастацтвы;

звычаі, абрады, святы;

веды і сацыяльныя практыкі, якія адносяцца да прыроды і сусвету;

веды і навыкі, звязаныя з традыцыйнымі рамёствамі.

Пры стварэнні беларускага Інвентара нематэрыяльнай культурнай спадчыны (http://livingheritage.by/) для класіфікацыі элементаў НКС на падставе Канвенцыі былі вылучаны наступныя катэгорыі:

выканальніцкія мастацтвы;

вусныя традыцыі і формы выражэння;

светапогляд людзей, міфалогія;

традыцыйныя рамёствы;

традыцыйная ежа;

практыкі захавання;

традыцыйныя цырымоніі.

У Інвентар НКС уключаюцца звесткі пра элементы, якія прайшлі працэс ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі, у выніку якога была падрыхтавана прапанова аб наданні статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Пасля ажыццяўлення працэдур, прадугледжаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, гэтыя элементы НКС, уключаюцца ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржспіс). Кароткія звесткі пра іх (назва, лакалізацыя, шыфр, катэгорыя, спасылкі на дакументы) размешчаны ў главе 3 “Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь”.

У Інвентары НКС на сайце “Жывая спадчына Беларусі” публікуюцца падрабязныя звесткі пра нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, сабраныя у працэсе інвентарызацыі – асноўныя ідэнтыфікацыйныя характарыстыкі, гісторыя паходжання і вывучэння, апісанне элемента НКС, яго сацыяльныя і культурныя функцыі, пагрозы для існавання, звесткі аб супольнасці носьбітаў, арганізацыях, адказных за захаванне, навуковыя экспертныя заключэнні, матэрыялы фота- і відэафіксацыі.

Адпаведна Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб культуры нематэрыяльным гісторыка-культурным каштоўнасцям надаюцца катэгорыі адрозныя ад Інвентара НКС. Згодна п. 3 арт. 96 вылучаюцца дзве катэгорыі: “А” – гісторыка-культурныя каштоўнасці, поўная аўтэнтычнасць і дакладнасць якіх безумоўныя і нязменныя, і “Б” – гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія поўнасцю або часткова адноўлены (зафіксаваны) на другасным матэрыяле ці аб’ектыўна з часам могуць змяняцца. Гэтыя катэгорыі адлюстроўваюць асаблівасці гісторыі бытавання элемента і амаль не маюць практычнага значэння ў справе захавання спадчыны.

Катэгорыі, вылучаныя ў Інвентары НКС, дазваляюць аналізаваць працэсы захавання спадчыны з улікам асаблівасцей жыццядзейнасці розных абласцей НКС. На элементы кожнай з гэтых катэгорый працэсы інвентарызацыі і надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці аказваюць розны ўплыў – ад зусім нязначных зменаў у бытаванні да вельмі істотных трансфармацый формаў і маштабаў існавання. Настаў час, калі неабходна гаварыць не толькі пра ахову нематэрыяльнай спадчыны ў цэлым, але і пра выпрацоўку адмысловых падыходаў да захавання розных катэгорый нематэрыяльнай спадчыны.

На пачатак 2020 г. у Дзяржспіс былі ўключаны 143 нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, з іх 92 элементы НКС, якія адпавядаюць вызначэнню Канвенцыі 2003 г. і 51 геральдычны і тапанімічны аб’ект адпаведна арт. 69 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. Сярод 92 адметных праяў НКС статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці маюць 36 традыцыйных рамёстваў, 21 традыцыйная цырымонія, 13 выканальніцкіх мастацтваў, 11 лакальных праяў традыцыйнай беларускай кухні, 6 праяў светапогляду і міфалогіі, 5 вусных традыцый. Іх размеркаванне па абласяцях паказана ў табліцы:

*Колькасць элементаў НКС, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (23.11.2004 – 20.02.2020)*

| Назва вобласці | Катэгорыі згодна Інвентару НКС | | | | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Выканальніцкія мастацтвы | Вусныя традыцыі | Светапогляд людзей, міфалогія | Традыцыйныя рамёствы | Традыцыйная ежа | Традыцыйныя цырымоніі | |
| Брэсцкая | **1** | **-** | **1** | **6** | **3** | **5** | **16** |
| Віцебская | **1** | **3** | **-** | **6** | **3** | **2** | **15** |
| Гомельская | **3** | **-** | **1** | **3** | **-** | **5** | **12** |
| Гродзенская | **2** | **-** | **1** | **10** | **4** | **1** | **18** |
| Магілёўская | **3** | **-** | **1** | **6** | **-** | **4** | **14** |
| Мінская | **2** | **2** | **2** | **4** | **1** | **4** | **15** |
| г. Мінск | **1** | **-** | **-** | **1** | **-** | **-** | **2** |
| Усяго | **13** | **5** | **6** | **36** | **11** | **21** | **92** |

Даволі вялікая колькасць элементаў некаторых катэгорый дае магчымасць прасачыць уплыў надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці на працэсы захавання, аднаўлення і падтрымкі жыццяздольнасці адметных праяў НКС.

Традыцыйныя рамёствы – самая шматлікая група элементаў у Дзяржспісе, сярод іх 10 адметных ткацкіх тэхналогій , 9 мастацкіх практык саломапляцення, па 2 рэгіянальныя традыцыі ганчарства, шапавальства, вырабу музычных інструментаў і многія іншыя рамёствы, што захоўваюцца асобнымі майстрамі або творчымі аб’яднаннямі. Для большасці з іх статус гісторыка-культурнай каштоўнасці мае рэпрэзентатыўнае значэнне і не моцна ўплывае на жыццядзейнасць, паколькі яна і так даволі добра арганізавана. У некаторых выпадках наданне статусу спрыяе арганізацыі мерапрыемстваў па пераемнасці рамяства, становіцца дадатковай падставай для арганізацыі выставак, музейных экспазіцый, правядзення святаў. Усім, так ці інакш, прыходзіцца вырашаць праблему запатрабаванасці ведаў і навыкаў, звязаных з традыцыйнымі рамёствамі ў сучасным свеце, а таксама змены функцый і прызначэння вырабаў для сучасных спажыўцоў.

Наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, безумоўна, спрыяе пашырэнню вядомасці аб рамёствах, промыслах і творчасці майстроў. Больш шырокую вядомасць пасля атрымання статусу набылі лясное бортніцтва, інсітнае мастацтва, спіральнае пляценне, выраб адметнага строю лелікаўскай свахі і інш.

На жаль, у асобных выпадках пераемнасць майстэрства арганізаваць не ўдаецца нават з дапамогай мерапрыемстваў, прадугледжаных статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці. Часцей за ўсё ў такой сітуацыі аказваецца адметнае майстэрства, увасобленае адзіным ў сваёй галіне таленавітым майстрам. Такім быў майстар вырабаў з дрэва Мікалай Тарасюк з Пружанскага раёна, індывідуальна сёння працуе майстар музычных інструментаў Мар’ян Скрамблевіч з Гродзенскага раёна, не мае пераемнікаў майстар па вырабу драўляных музычных інструментаў Аляксандр Харкевіч з Круглянскага раёна. У Інвентар НКС уключаны веды і ўменні па выкручванню дудкі, якімі валодае Фёдар Муравейка з Салігорскага раёна, але прапанова па ўключэнню гэтага архаічнага майстэрства ў Дзяржспіс таксама была адхілена ў сувязі з адсутнасцю ўстойлівай пераемнасці.

У Дзяржспіс уключана больш 20 разнастайных традыцыйных цырымоній. Два старажытныя абрады з Гомельшчыны былі першымі элементамі НКС, якія атрымалі статус гісторыка-культурнай каштоўнасці ў 2007 г. – гэта абрад “Юр’я” у в. Пагост Жыткавіцкага раёна і “Ваджэнне і пахаванне стралы” у в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна. Лёс іх аказаўся, на дзіва, розным. Абрад “Юр’я” у 2019 г. уключаны ў спісы нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, а абрад у Казацкіх Балсунах ужо не праводзіцца. Але ў цэлым, за невялікім

выключэннем, на правядзенне традыцыйных народных абрадаў, уключэнне ў Дзяржспіс аказвае станоўчы ўплыў. Яны становяцца больш вядомымі і запатрабаванымі як у сваёй мясцовасці, так і ў асяроддзі аматараў народнай творчасці, турыстаў і гасцей рэгіёна. Калі жадаючых наведаць свята становіцца многа, то ў дзень правядзення абраду ладзяцца розныя творчыя праграмы, фестывалі і кірмашы. Гэта дае магчымасць паказаць культурныя здабыткі раёна, стварае попыт на тавары мясцовых майстроў і паслугі ўстаноў культуры. Напрыклад, перад традыцыйным абыходам “Калядных цароў” у аг. Семежава Капыльскага раёна, адбываецца кірмаш з прадажай мясцовай прадукцыі, выступленнямі фальклорных калектываў. Раённы цэнтр ткацтва ладзіць экскурсіі, на якіх прадстаўляе яшчэ адну нематэрыяльную гісторыка-культурную каштоўнасць – закладную тэхніку ткацтва чырвона-белых ручнікоў, а таксама сваю багатую экспазіцыю традыцыйных ткацкіх вырабаў.

Уключаны ў Дзяржспіс некаторыя хрысціянскія абрады, у якіх склаліся адметныя мясцовыя традыцыі правядзення. Але ў рэлігійных практыках невялікіх вёсак паступова знікаюць мясцовыя адметнасці, адбываецца пэўная ўніфікацыі традыцыйных святочных богаслужэнняў як у каталіцкай, так і ў праваслаўнай царкве. Напрыклад, у в. Папшычы Глыбоцкага раёна падчас шэсця на свята Спаслання Святога Духа ўжо не разгортваюць намётку па патрабаванню біскупа; на ўрачыстаць Святых Пятра і Паўла ў Чэрыкаўскім раёне не ладзяць шэсце з іконай з в. Наркі да крыніцы “Бразгун”, бо ікона, якая захоўвалася ў мясцовых жыхароў перададзена ў царкву (мал. 1, мал. 2); усё менш людзей удзельнічае ў пераносе свячы з дому ў дом ў вёсках, дзе доўгі час падтрымліваўся такі звычай.

Пры падрыхтоўцы прапаноў аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці выканальніцкім мастацтвам, праводзіцца грунтоўнае вывучэнне і навуковая апрацоўка лакальнай спеўнай або танцавальнай традыцыі, вылучаюцца яе адметныя мастацкія вартасці, на захаванне якіх павінна быць скіравана дзейнасць па ахове. Працэс падрыхтоўкі прапановы і надання статусу аказвае станоўчы ўплыў на вывучэнне і прэзентацыю традыцыі, а таксама на дзейнасць фальклорнага гурта, які яе падтрымлівае. Але, калі праходзіць некаторы час, і перастаюць спяваць таленавітыя аўтэнтычныя выканаўцы, то часта не стае механізмаў для арганізацыі пераемнасці з захаваннем высокага мастацкага ўзроўню выканання і адлюстраваннем усіх лакальных адметнасцей спеву. Засваенне спеўнага майстэрства патрабуе значна больш працяглага часу, чым арганізацыя свята ці абраду, таму для падтрымкі пераемнікаў спеўнага, танцавальнага, музычнага мастацтва патрабуюцца адмысловыя праграмы.

Наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці адметным праявам традыцыйнай беларускай кухні заўсёды ўспрымаецца з энтузіязмам гаспадынямі і ўстановамі культуры. Цікавасць і практычная рэалізацыі дадатковай увагі

да з’явы хутка знаходзіць сваё ўвасабленне. Тут часцей узнікаюць цяжкасці пры падрыхтоўцы дакументаў на статус, бо ў навукоўцаў не хапае факталагічных звестак пра распаўсюджанасць стравы або тэхналогіі прыгатавання ў мінулым і ў сучаснасці. Ужо ў працэсе падрыхтоўкі дакументаў вывучалася распаўсюджанасць традыцыйных клёцак на Віцебшчыне, банкухі наГродзеншчыне, выкарыстанне спосабу прыгатавання рыбы ў печы на саломе сучаснымі гаспадынямі. Да гэтага часу не ўдалося зрабіць адпаведную навуковую апрацоўку сучаснага стану традыцыйная сялянскай кухні на Магілёўшчыне.

Іншыя катэгорыі НКС у Дзяржспісе не такія шматлікія, і, верагодна, яшчэ рана рабіць агульныя высновы наконт уплыву на іх статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Дзейнасць па захаванню элементаў НКС кожнай катэгорыі патрабуе выпрацоўкі такіх падыходаў да аховы, якія найлепшым чынам забяспечваюць жыццядзейнасць разнастайных праяў нематэрыяльнай спадчыны. Гэта работа яшчэ наперадзе.

У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры пакуль што толькі два невялікія артыкулы (арт. 103 і арт. 104) прысвечаны пытанням захавання нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. У той жа час пытанні захавання матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей рэгулююць больш 20 артыкулаў Кодэкса.

Пры арганізацыі дзейнасці па ахове НКС неабходна ўлічваць рэкамендацыі Аператыўнага кіраўніцтва па выкананню Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У 2018 г. ЮНЕСКА прапанавала новую сістэму ацэнкі вынікаў работы па ахове НКС, якая ўключае 26 ключавых паказчыкаў, сярод якіх праграмы падтрымкі ўмацавання чалавечага патэнцыялу, палітыка ў сферы культуры і адукацыі, прававыя і адміністратыўныя меры, пашырэнне ўдзелу ўсіх зацікаўленых бакоў, грамадзянскай супольнасці і інш. Рознабаковая ацэнка гэтых паказчыкаў ляжа у аснову чарговай справаздачы Рэспублікі Беларусь аб выкананні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

*Ліпень, 2020 г.*

*Алена Каліноўская,*
*вядучы спецыяліст ІПКіПК БДУКМ*